***Удзельнікам XIX Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Журналістыка-2017: стан, праблемы і перспектывы»***

## Паважаныя калегі!

*Традыцыйная Міжнародная навукова-практычная канферэнцыя «Журналістыка-2017: стан, праблемы і перспектывы» – сведчанне адкрытасці беларускай інфармацыйнай прасторы, імкненне прадстаўнікоў айчынных СМІ і навукоўцаў да дыялогу, абмену прафесійным і творчым вопытам.*

*Сучасны стан медыяпрасторы Рэспублікі Беларусь дазваляе гаварыць аб устойлівай тэндэнцыі тэхналагічнага ўдасканальвання, планамернай інтэграцыі ў еўрапейскія і сусветныя камунікацыйныя працэсы. Перспектывы павышэння якаснага ўзроўню работы нацыянальных СМІ непасрэдна звязаны з кваліфікацыяй спецыялістаў. Правядзенне канферэнцый, семінараў, форумаў спрыяе развіццю тэорыі журналістыкі, удасканаленню прафесійнага вопыту дзейнасці спецыялістаў сродкаў масавай інфармацыі.*

*У гэтым годзе навукова-практычная канферэнцыя, у рабоце якой прымаюць удзел вядучыя вучоныя ў галіне журналістыкі і камунікацыі, прадстаўнікі міністэрстваў, работнікі СМІ, стане чарговай прыступкай у асэнсаванні сучаснага стану медыйнай сферы, дапаможа ў вызначэнні далейшых шляхоў яе развіцця.*

*Спадзяюся, што канферэнцыя стане трыбунай для сур'ёзнага абмену меркаваннямі па тых праблемах, якія ўяўляюць інтарэс не толькі для журналістаў, але і для шматлікай аўдыторыі нацыянальных і замежных медыя.*

*Жадаю ўдзельнікам канферэнцыі паспяховай работы і навуковых адкрыццяў!*

***Сяргей Валянцінавіч ДУБОВІК,***
***дырэктар Інстытута журналістыкі***
***Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта***